несур'ёзна пра сур'ёзнае

Міхась Сліва



# праўда ў вочы

**Міхась Сліва**

# Праўда ў вочы

## Серия «Несур’ёзна пра сур’ёзнае»

*Текст предоставлен правообладателем*
*http://www.litres.ru/pages/biblio_book/?art=40901745*
*Міхась Сліва. Праўда ў вочы: Четыре четверти; Минск; 2019*
*ISBN 978-985-581-126-9*

## Аннотация

У новай кнізе пісьменніка-гумарыста Міхася Слівы змешчаны творы, напісаныя ў апошнія гады. Аўтар умее ў звычайным убачыць незвычайнае і з уласцівым яму гумарам, цікава і займальна паказаць чытачу многія з’явы сучаснага жыцця.

# Содержание


Рабы кахання 7
- Рэцэпт для пахудзення 7
- Год Каня 9
- Праўда ў вочы 11
- Дзень памяці ахвяр алкагалізму 13
- Дакладная запіска 15
- Узнагароджанне 17
- Псіхатэрапія 20

Конец ознакомительного фрагмента. 21

# Міхась Сліва
# Праўда ў вочы
# Гумар і сатыра

© Сліва М., 2019
© ТДА «Выдавецтва “Чатыры чвэрці”», 2019

# Міхась Сліва



Аўтар шматлікіх кніг прозы «Усмешка Джаконды», «Прыгожыя караблі», «Запрашаю ўсміхнуцца», «Ход канём», «Сустрэліся кум з кумой», «Віртуальнае каханне», «Радасць жыцця», «Клюква по знакомству», «Жыццё на Парнасе», «…І мора па калена»; кніг для дзяцей «Кот Матрос», «Як кнігі дзяўчынку выхавалі»; зборнікаў літаратуразнаўчых і літаратурна-крытычных артыкулаў і рэцэнзій «Найвышэйшае і светлае» і «Лік, які выратоўвае»; публікацый у калектыўных зборніках, альманахах, часопісах, газетах.

Уганараваны рэспубліканскай літаратурнай прэміяй «Залаты Купідон». Лаўрэат абласных літаратурных прэмій імя К. Тураўскага і А. Капусціна, лаўрэат конкурсу Беларускага саюза журналістаў «Залатое пяро».

Член Саюза пісьменнікаў Беларусі і Беларускага саюза журналістаў.

# Рабы кахання

## Рэцэпт для пахудзення

З самай раніцы наш аддзел гудзеў, як пчаліны рой у спякотны дзень.

– Ой, дзяўчаткі! – радасна расказвала эканаміст Інэса Данілаўна. – Такога рэцэпта вы яшчэ не ведаеце! Напісана, што за месяц можна лёгенька, не напружваючыся, скінуць больш за пяць кілаграмаў. Акрамя таго, умацоўваецца імунітэт, павышаюцца абарончыя здольнасці арганізма супраць многіх інфекцыйных захворванняў. Цуд!

Інэса Данілаўна хуценька зрабіла на ксераксе некалькі копій і пачала раздаваць усім жадаючым. Нам з Мікалаем Кірылавічам, маім калегам, таксама інжынерам, рэцэпта не дасталося, але ён нам і не патрэбен. Астатнія ж супрацоўнікі нашага аддзела – дзяўчаты і замужнія жанчыны – тут жа прачыталі рэцэпт і дамовіліся худзець калектыўна.

Сталі заварваць і піць імбірны чай. Хтосьці прынёс з дому вялізны тэрмас, і сама Інэса Данілаўна рыхтуе лячэбны адвар. П'юць яго жанчыны амаль праз кожную гадзіну: чым часцей прымаеш, тым большы эфект. А ўсім жа хочацца, каб атрымалася як мага хутчэй. П'юць дружна, па ўказанай норме. Па добрай традыцыі кожны раз перад прыняццем лячэб-

нага эліксіру жанчыны па чарзе ходзяць у буфет. Як заўсёды, прыносяць што-небудзь новенькае і смачнае: то піражныя, то булачкі з макам, то пончыкі, то піражкі з мясам або капустай, павідлам ці тварагом, а часта і бутэрброды з каўбасой. У нашым буфеце выбар вялікі, можна задаволіць любы густ!..

Трэба адзначыць, што рэцэпт для пахудзення спадабаўся ўсім. Цяпер гэты вопыт пераймаюць іншыя аддзелы і ўпраўленні нашай арганізацыі. Усе жанчыны з нецярпеннем чакаюць канца месяца, калі будуць узважвацца. Мы з Мікалаем Кірылавічам нават не сумняваемся, што вынікі такога напружанага пахудзення будуць ашаламляльныя…

# Год Каня

Іван Пятровіч сваю жонку баяўся заўсёды. А ў апошнія гады, калі яна захапілася акультнай літаратурай, рознымі гараскопамі і прымхамі, яму стала яшчэ цяжэй.

Перад Новым годам, годам Змяі, жонка загадала абавязкова знайсці змяю, каб тая была ў кватэры ў навагоднюю ноч. Тады, маўляў, цэлы год будзе шанцаваць ва ўсіх сферах жыцця! Выручыў, як часта здаралася, школьны сябар Гоша, які працуе вартаўніком у заапарку. Дамовіўся за пляшку з даглядчыкам і даў на суткі Івану Пятровічу рэптылію.

У год Сабакі было лягчэй. Маці суседа Цімоха ў вёсцы трымае ажно двух сабак. Жыве на ўскрайку вёскі, каля лесу. Страшнавата адной, асабліва доўгімі зімнімі начамі, бо могуць наведацца не талькі чатырохногія, але і двухногія «ваўкі». Дык вось, за магарыч Цімох прывёз Івану Пятровічу аднаго сабаку, які пражыў у кватэры тыдні з два. Жонка аж цвіла ад радасці, бо і на стары Новы год была з сабакам. А значыць – чакай удачы!

І вось наступае год Каня. Жонка маўчала, але была надта ўзвінчанай, зноў чытала гараскопы.

…Іван Пятровіч стаў ламаць галаву, дзе ўзяць каня. Два дні хадзіў сам не свой. З гора зайшоў у «Мінутку», стаў у чаргу за хлопцамі з чырвона-сінімі насамі, глынуў стаграмовік, не паспеў і прыкусіць піражком, як убачыў аднаго дзяд-

зьку – і адразу ж з’явілася ідэя: «Ён жа возіць на кані прадукты ў дзіцячы садок. Можна будзе дамовіцца!..»

Іван Пятровіч імгненна падскочыў да буфетчыцы і заказаў яшчэ па сто грамаў на дваіх. Запрасіў дзядзьку, пазнаёміўся. Кузьма Уладзіміравіч – так звалі таго – аказаўся чалавекам спагадлівым: за бутэльку віна згадзіўся даць у навагоднюю ноч каня. Да раніцы патрымаць у кватэры. Толькі, калі пачуў, што кватэра на другім паверсе, крыху засумняваўся.

– Я завяду яго! – рашуча пераконваў Іван Пятровіч. – Вазьму з сабой аўса ў вядро – ён і пойдзе!

І вось наступіў пераднавагодні вечар. Іван Пятровіч знарок не паказваўся цэлы дзень. А вечарам зайшоў у двор садка, дзе яго ўжо чакаў Кузьма Уладзіміравіч з канём. Аддаў бутэльку віна, пажадаў шчаслівага Новага года.

…Ярка свяціліся вокны ў яго кватэры. Мільгалі галовы дзяцей. Жонка была ў «трансе», бо лямант яе быў чуваць ажно на вуліцы. «Нічога, зараз сціхне», – прашаптаў Іван Пятровіч і весела рушыў з канём у пад’езд і далей у сваю аднапакаёвую «хрушчоўку».

# Праўда ў вочы

Аднойчы ў абедзенны перапынак супрацоўнікі нашай фірмы завялі размову пра паводзіны эканаміста Сямёнава.

– Ён увесь час гаворыць усім толькі прыемныя словы, кампліменты мне сыпле, але ж я не веру ў шчырасць яго слоў! – катэгарычна заявіла галоўны бухгалтар Інэса Алегаўна.

– Сапраўды, – падтрымаў яе начальнік аддзела кадраў Рамізін, – ён, у адрозненне ад нас, ніколі не выказаў свайго абурэння паводзінамі дырэктара. Хіба ён не ведае, што шэф з намі грубы, з кліентамі нахабнічае… Дык не, Сямёнаў і слова дрэннага не скажа!

– Ён проста баіцца сказаць людзям праўду ў вочы! – уключылася ў размову і менеджар Ганна Патапаўна, стрыечная сястра дырэктара. – Хіба ў нас няма недахопаў? Хоча быць для ўсіх добранькім. А трэба быць прынцыповым!..

Усю гэтую размову чуў сам эканаміст, бо яго кабінет быў побач, а гукаізаляцыя дрэнная. Сямёнаў набраўся цярпення і зрабіў выгляд, што нічога не ведае. Але ж зерне, кінутае калегамі, дало свае ўсходы. «Можа, і сапраўды, яны маюць рацыю? – пачалі свідраваць думкі. – Відаць, трэба быць смялейшым, не баяцца выказаць сваё меркаванне, тым больш што гэта будзе імпанаваць супрацоўнікам фірмы».

…І вось праз дзень-другі Сямёнаў, забіраючы ў галоўнага бухгалтара накладныя на чарговую партыю тавараў, не стры-

маўся і сказаў тое, што думаў. А менавіта выказаў абурэнне, што Інэса Алегаўна, як заўсёды, затрымала аплату па дакументах, няўважліва адносіцца да даручэнняў кіраўніцтва і наогул тармозіць многія добрыя пачынанні. Інэса Алегаўна пазелянела ад злосці і сціснула кулачкі. Стала падбіраць патрэбныя словы, каб выказаць сваё абурэнне паводзінамі Сямёнава, але ён хуценька шмыгнуў за дзверы.

Назаўтра эканаміст у размове з сакратаркай у прысутнасці начальніка аддзела кадраў выказаў нязгоду з новымі ідэямі і патрабаваннямі дырэктара. А потым, разгарачыўшыся, ляпнуў, што дырэктар – яшчэ большы лайдак, чым менеджар Ганна Патапаўна…

Праз некаторы час з Сямёнавым перастала вітацца Ганна Патапаўна, галоўны бухгалтар пры сустрэчах злосна зыркала на яго, а дырэктар не запрашаў да сябе, як раней, каб параіцца.

А неўзабаве начальнік аддзела кадраў Рамізін зайшоў у кабінет эканаміста і паведаміў, што праз месяц з ім заканчваецца кантракт. Але ўжо вядома рашэнне дырэктара, што на новы тэрмін ён падпісаны не будзе…

# Дзень памяці ахвяр алкагалізму

Якіх толькі свят, знамянальных дат і дзён не адзначаем мы штогод! І ўсе яны патрэбныя. Лічу, што неабходна абавязкова ўключыць у спіс і яшчэ адзін, для некаторых грамадзян надзвычай важны дзень, які многія будуць адзначаць, – Дзень памяці ахвяр алкагалізму.

Упэўнены, што мяне падтрымаюць тыя, хто сутыкнуўся з гэтай з’явай. За прыкладамі далёка хадзіць не буду. Вось быў у мяне сябрук Мікола, разам са мной працаваў на мэблевай фабрыцы. Абодва мы – хлопцы мяккахарактарныя, спагадлівыя. Калі хто папросіць вынесці пару-другую дошак або брускоў, мы не маглі адмовіць. Ну, а ў канцы змены, як і належыць, па пляшцы-другой віна выпівалі. Карацей кажучы, ніколі не прасыхалі! У рэшце рэшт дабрата наша бокам вылезла: мяне з фабрыкі вытурылі, а Мікола – царства яму нябеснае! – і да пенсіі не дажыў… А ўсё яны, гарэлка ды віно праклятыя, вінаватыя ў гэтым! Мы з Міколам – іх ахвяры!

А вунь мой сусед Валодзька Мармузевіч нават начальнікам канторы быў. Няблага, кажуць, кіраваў, але ж вельмі любіў пасля працоўнага дня зняць стрэс. Але неўзабаве і самога знялі… з пасады, а праз год і наогул яго не стала…

Пайшоў у лепшы свет і мой зямляк Антон Нупрэйчыкаў. Як кажуць, кожны дзень «квасіў». Характар, праўда, быў у яго паскудны: напіўшыся, Антон заўсёды пускаў у ход кула-

кі. Таму пасля таго, як ён цёплым летнім днём захлынуўся ад гарэлкі, жонка надта не бедавала. Але ж многія аднавяскоўцы шкадавалі, бо за шклянку віна ці самагонкі Антон ахвотна дапамагаў і прысядзібныя ўчасткі апрацоўваць, і іншыя гаспадарчыя работы выконваць.

Сярод ахвяр, якія патрабуюць успамінаў і ўшанавання, яшчэ адзін мой сусед – Руслан Пеўнеў. Залатыя рукі былі ў чалавека! Нялёгка яму даводзілася: з-за стану здароўя нельга было чарку браць, але ж за яго працу кожны стараўся наліць. Бо працаваў Руслан слесарам-сантэхнікам.

А колькі небарак у нецвярозым стане згарэла і працягваюць гінуць ва ўласных хатах пры пажарах! А колькі чалавек развіталася з жыццём падчас п’яных разборак з жонкамі ды сябрукамі! Пералік ахвяр Бахуса можна працягваць. Ён патапіў людзей у чарцы больш, чым іх загінула ў акіяне…

Вось я і прапаную ўвесці ў наш ужытак Дзень памяці ахвяр гэтага крыважэрнага цмока – зялёнага змея. Давайце ўспомнім паімённа ўсіх, хто аддаў душу д’яблу п’янства. Лічу, што той, хто жлукціць спіртное, але пакуль яшчэ жывы, будзе ведаць, што імя яго захаваецца ў гісторыі. Праўда, у асобным спісе – п’яніц і алкаголікаў.

# Дакладная запіска

Начальніку райсельгасхарчу
Чарназёмаву Івану Кузьмічу
ад дырэктара саўгаса
«Шырокія гарызонты»
Пеўнікава Віктара Пятровіча

Даводжу да Вашага ведама, што рэдакцыя нашай раённай газеты праводзіць няправільную работу. Мяркуйце самі.

У апошнім нумары газеты быў надрукаваны крытычны матэрыял, у якім расказвалася аб дрэннай арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці ў нашым саўгасе «Шырокія гарызонты». Да таго ж былі змешчаны і фотаздымкі, якія адлюстроўваюць непрывабны стан спраў у гаспадарцы, якой я паспяхова кірую ўжо некалькі гадоў.

Сапраўды, як Вы і самі добра ведаеце, ураджай збожжавых і іншых культур мы вырасцілі нядрэнны, але загубілі, своечасова не ўбралі. Праўда і тое, што надоі малака знізіліся ўдвая, а прывагі буйной рагатай жывёлы ў нас ніжэй, чым у самых адсталых гаспадарках. Дапусцілі мы і падзёж жывёлы, а на ферму ў нас не зайсці з-за гною і бруду. Згодзен, шмат недаробак і ў іншых справах. Дастаткова ўспомніць, колькі новай тэхнікі мы ўгробілі за апошнія два гады, амаль уся яна

стаіць пад плотам.

Можна сказаць, што сваім крытычным матэрыялам газета пляснула мяне тварам у лужыну. Але ж і на Вас пырскі паляцелі. Цяпер кожны жук і жаба паказвае пальцам на мяне, не ведаю ўжо, куды вочы дзяваць. Карацей кажучы, заварылі кашу газетчыкі.

Улічыце, шаноўны Іван Кузьміч, што публікацыя ў газеце матэрыялаў, якія раскрываюць нашу безгаспадарчасць, наносіць вялікую шкоду нашаму з Вамі аўтарытэту.

Улічваючы ўсе гэтыя акалічнасці, прашу Вас, Іван Кузьміч, націснуць на ўсе кнопкі, каб у газеце больш не паяўлялася крытычных матэрыялаў у наш адрас, а змяшчаліся толькі станоўчыя.

З надзеяй на дапамогу,
*В. Пеўнікаў*

# Узнагароджанне

У разгар рабочага дня ў кабінеце намесніка дырэктара ўстановы пачуўся тэлефонны званок. Трубку ўзяў гаспадар кабінета – Ігар Пятровіч.

– Добры дзень! Турбуе Галубіцкая…

– Я пазнаў вас, Вольга Піліпаўна, пазнаў! – падхапіўся намеснік дырэктара. І ўжо стоячы працягваў размову, бо недзе вычытаў, што так лепш думаецца, чым тады, калі сядзіш у крэсле пры размове.

– А дзе ваш дырэктар? – уладным голасам спытала Галубіцкая, намеснік старшыні райвыканкама, якая курыравала пытанні сацыяльнай сферы жыцця ў раёне.

– Артур Антонавіч паехаў на раён, будзе позна, – як школьнік адрапартаваў Ігар Пятровіч, хоць добра ведаў, што яго шэф у гэты час разам з двума сваімі падначаленымі займаецца будаўніцтвам лазні на дачы. Між іншым, ён не надта і хлусіў: дача ж шэфа знаходзіцца за горадам, «на раёне»…

– У такім разе зрабіце без яго! – скамандавала Вольга Піліпаўна, якая, як вядома, кіраваць любіла. – Тэрмінова падрыхтуйце неабходныя матэрыялы на ўзнагароджанне вашага галоўнага спецыяліста Івана Міхайлавіча Ключнікава і да канца дня перадайце нам!

У калектыве ўстановы ўжо была размова аб падвядзенні вынікаў работы за мінулы год і ўдзеле ў традыцыйнай што-

гадовай цырымоніі ўзнагароджання за дасягненні ў сацыяльна-культурнай дзейнасці. Таму Ігар Пятровіч успрыняў загад падрыхтаваць адпаведныя паперы як усё зразумелае. Выканаць гэтае заданне раённага начальства яму дапамог сам Ключнікаў, які і даставіў потым матэрыялы ў райвыканкам.

Дырэктар жа адсутнічаў на рабоце яшчэ два дні, да выхадных. Як паведаміў усім яго вадзіцель, шэф узяў бальнічны ліст.

У панядзелак Артур Антонавіч з’явіўся на рабоце пасля aпаратыўнай нарады ў райвыканкаме. І тут жа выклікаў да сябе намесніка…

Праз некаторы час Ігар Пятровіч выйшаў ад яго як у ваду апушчаны. Узрушаны, нейкі задуменны. Заглянуў у кабінет Ключнікава.

– Іван Міхайлавіч, бяда! Шэф зусім азвярэў. Крычыць, чаму без яго ведама аддалі матэрыялы на ваша ўзнагароджанне. Яшчэ і на агульным сходзе будзе рваць мне нервы, і наогул спуску не дасць…

– Не хвалюйся, зараз усё нармалізуем! – хітра ўсміхнуўся Іван Міхайлавіч, які быў амаль удвая старэй за намесніка дырэктара, выдатна ведаў нораў Артура Антонавіча. Таму рашуча накіраваўся ў кабінет дырэктара. І яшчэ з парога пачаў размову:

– Дзякуй вам, Артур Антонавіч, за дапамогу і падтрымку! Калі б не вы, то не ведаю, што было б…

Шэф спачатку разгубіўся, пачырванеў, падумаў, відаць,

што Іван Міхайлавіч іранізуе. А потым узяў сябе ў рукі і марудна, з цяжкасцю падбіраючы словы, стаў гаварыць:

– Гэта ж яшчэ месяц таму ў райвыканкаме зайшла размова, што рыхтуецца чарговая цырымонія ўзнагароджання перадавікоў народнай гаспадаркі, дык я хуценька напісаў паперу на цябе і сам адвёз. Так што гэта мая заслуга ў тым, што цябе ўзнагародзяць!..

– Яшчэ раз дзякуй вам, Артур Антонавіч! – весела ўсклікнуў Іван Міхайлавіч і паімчаў да намесніка дырэктара.

– Можаш спаць спакойна: шэф сказаў мне, што гэта ён падрыхтаваў патрэбныя паперы і адвёз у райвыканкам (ты толькі громка не смейся!). А ён жа, як ведаеш, кожны раз падкрэслівае, што ніколі не хлусіць!..

Услед за Іванам Міхайлавічам рассмяяўся і Ігар Пятровіч, яшчэ раз пераканаўшыся, які абармот іх шэф.

# Псіхатэрапія

Язэп Іванавіч задаволены выйшаў ад доктара. Вядомы на ўсю акругу ўрач-псіхатэрапеўт Аляксандраў аказаў яму патрэбную дапамогу: уважліва выслухаў, даў карысныя рэкамендацыі, каб супакоіць нервы ў свайго пацыента, выпісаў рэцэпт на добрае лякарства, правёў сеанс псіхатэрапеўтычнага ўздзеяння. Асабліва ж раіў Язэпу Іванавічу не звяртаць увагі на разнастайныя жыццёвыя дробязі. Не сакрэт жа, што недахопы ўсюды ёсць, таму трэба адносіцца да гэтага спакойна, заўважаць толькі светлае, добрае, радавацца кожнаму пражытаму дню. Тады і дэпрэсіі ніякай не будзе, і ціск не павысіцца, і сэрца перастане балець, і наогул самаадчуванне стане выдатным. Нават калі ў цябе пенсійны ўзрост…

# Конец ознакомительного фрагмента.

Текст предоставлен ООО «ЛитРес».

Прочитайте эту книгу целиком, купив полную легальную версию на ЛитРес.

Безопасно оплатить книгу можно банковской картой Visa, MasterCard, Maestro, со счета мобильного телефона, с платежного терминала, в салоне МТС или Связной, через PayPal, WebMoney, Яндекс.Деньги, QIWI Кошелек, бонусными картами или другим удобным Вам способом.